ISSN 0321-1649 (print)

## *ХРОНІКА*
### *CHRONICLE*

Поступила в редакцию 02.12.2015
Received 02.12.2015

**Т. І. Адула**

*Інстытут філасофіі НАН Беларусі, Мінск, Рэспубліка Беларусь*

# ЗМЕНЛІВЫЯ КОНТУРЫ СВЕТУ XXI СТАГОДДЗЯ

Імклівая і непрадказальная штодзённасць сучаснай гісторыі стала пунктам адліку для большасці палітыкаў і навукоўцаў. І справа зусім не ў храналагічных рамках, што фіксуюць усталяванне новага тысячагоддзя, а хутчэй за ўсё ў тых рэзкіх зменах, што прыйшліся менавіта на гэты гістарычны адрэзак часу, ахапілі эканамічную, тэхніка-тэхналагічную, палітычную і духоўную сферы жыццядзейнасці грамадства. Можна з упэўненасцю сцвярджаць: чалавецтва ўступіла ў новую гістарычную эпоху. Яна і падобна, і амаль зусім не падобна на папярэднія. Адной з важнейшых яе якасных характарыстык з'яўляецца глабалізацыя. Менавіта таму праблемы глабалізацыі на працягу апошніх гадоў прыцягваюць такую пільную ўвагу даследчыкаў.

Сусветна вядомая навуковая пляцоўка абмеркавання самых розных аспектаў глабалізацыі – Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М. В. Ламаносава, дзе маецца факультэт глабальных працэсаў. Вось і ў мінулым годзе там прайшоў чарговы, ужо чацвёрты па ліку, Міжнародны навуковы кангрэс «Глабалістыка-2015: глабальнае кіраванне і дыпламатыя ў нестабільным свеце», на які з'ехаліся больш за 500 навукоўцаў, палітыкаў, дыпламатаў з пяцідзесяці крін свету. Адметнасць форуму заключалася ў тым, што ён быў прысвечаны 70-годдзю Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і сваю працу праводзіў пад яе эгідай. Падрыхтоўкай такога маштабнага сусветнага форуму былі заняты многія навуковыя ўстановы і грамадскія арганізацыі – нараўне з МДУ імя М. В. Ламаносава і РАН у яго падрыхтоўцы прынялі ўдзел Міжнародная акадэмія глабальных даследаванняў, Грамадскі камітэт «ААН-70», Расійская асацыяцыя міжнародных даследаванняў, Расійская асацыяцыя садзейнічання ААН, Міжнародная грамадская арганізацыя «Еўразійская садружнасць», Міжнародны інстытут Піцірыма Сарокіна – Мікалая Кандрацьева, Расійскі інстытут стратэгічных даследаванняў, Расійская філасофскае таварыства і іншыя.

Кангрэс праходзіў з 25 па 30 кастрычніка 2015 года, і яго праграма аказалася вельмі насычанай. Асноўная тэматыка зафіксавана ўжо ў самой назве: размова ішла перш за ўсё пра нестабільнасць сусвету і магчымыя спосабы яе прадухілення. Кангрэс адкрыў рэктар МДУ імя М. В. Ламаносава акадэмік РАН В. А. Садоўнічы. З прывітальнымі словамі да ўдзельнікаў кангрэса звярнуліся старшыня Грамадскага камітэта «ААН-70», рэктар МДІМА акадэмік РАН А. В. Таркуноў, намеснік міністра замежных спраў Расійскай Федэрацыі В. А. Небензя, прэзідэнт Міжнароднай асацыяцыі «World History» Крэйг Бенджамін і іншыя. Прамоўцы звярнулі ўвагу на актуальнасць тэмы і прапанавалі ўдзельнікам кангрэса сканцэнтраваць увагу на высвятленні рэальных прычын нестабільнасці сусвету і распрацоўцы канкрэтных, навукова абгрунтаваных прапаноў пераадолення крызісу, усталявання ў грамадстве шчырасці, адкрытасці, дыялогу, сцвярджэння гуманізму.

На пленарным пасяджэнні, якое праходзіла ў актавай зале Інтэлектуальнага цэнтра Фундаментальнай бібліятэкі МДУ імя М. В. Ламаносава, з навуковымі дакладамі выступілі вядомыя вучоныя – дырэктар Інстытута Еўропы РАН, доктар палітычных навук А. А. Грамыка, прафесар універсітэта Де Бейра Інтэрыёр Цесалена Дэвезас (Бразілія), рэктар Лонданскай дыпламатычнай акадэміі Джозеф Міфсуд (Вялікабрытанія), прэзідэнт Міжнароднай асацыяцыі «World History», прафесар універсітэта Grand Valley Крэйг Бенджамін (ЗША), дырэктар Азіяцка-Ціхаакіянскага інстытута дыпламатыі Аўстралійскага нацыянальнага ўніверсітэта Йёхан Прантл (Аўстралія), прэзідэнт Міжнароднай экалагічнай недзяржаўнай арганізацыі "Dancing Star Foundation" Майкл Тобіас (ЗША). Кожны з дакладчыкаў выказаў свой адметны погляд на сучасны сусвет і тыя дынамічныя працэсы, што ў ім адбываюцца, але лейтматывам іх прамоў была ўсё ж агульная ідэя: наш сусвет не такі ўжо самазабяспечаны, як падаецца на першы погляд. Ён зузім не абаро-

© Адула Т. І., 2016

нены ад розных пагроз, якія значна памножыліся за апошнія дзесяцігоддзі. Таму трэба актывізаваць палітыкаў, кіраўнікоў, навукоўцаў, зрэшты, саміх грамадзян і зрабіць усё ад нас залежнае, каб не толькі спыніць сучасныя войны, насілле над чалавекам і прыродай, але і наогул прадухіліць магчымасць іх зараджэння ў будучым.

На вячэрнім пасяджэнні, якое прайшло ў Вялікім тэатры, адбылася прэзентацыя даклада «Глабальнаму ўніверсітэцкаму саміту BRICS». Тэма даклада абрана не выпадкова: справа ў тым, што Расія ў 2015 годзе старшынствавала ў гэтай міжнароднай суполцы. Кангрэс аднадушна падтрымаў прапанову рэктара МДУ В. А. Садоўнічага аб стварэнні Асацыяцыі навукова-адукацыйных цэнтраў краін BRICS і ўсталяванні больш грунтоўных навуковых кантактаў паміж навукоўцамі гэтых краін.

Як па тэматыцы, так і па сваіх арганізацыйных формах кангрэс аказаўся празмерна насычаным і разнастайным – нароўні з пленарным пасяджэннем і прэзентацыяй даклада «Глабальнаму ўніверсітэцкаму саміту BRICS» уключаў работу 8 секцый, 2 міжнародных навуковых канферэнцый, 2 міжнародных сімпозіумаў, 3 круглых сталоў, 3 майстар-класаў. Арганізатары правялі шэраг іншых, у тым ліку культурных мерапрыемстваў, а вядучыя замежныя спецыялісты прачыталі для студэнтаў лекцыі.

Звернем увагу толькі на асноўнай праблематыцы, паколькі не ўяўляецца магчымым ахапіць увесь шырокі спектр пытанняў, што знайшлі абмеркаванне і тэарэтычнае асэнсаванне на гэтым форуме.

У прадстаўленых дакладах і выступленнях у першую чаргу разглядаліся пытанні эканамічнага і палітычнага характару. Па-рознаму ўспрынялі і ацанілі ўдзельнікі кангрэса даклад саветніка прэзідэнта Расійскай Федэрацыі, акадэміка РАН С. Ю. Глазьева, з якім ён выступіў на пасяджэнні міжнароднага навуковага сімпозіума па ўстойлівым развіцці «Глабальнае развіццё: выклікі і канфлікты ў XXI стагоддзі». Вядомы эканаміст назваў стан расійскай эканомікі няўстойлівым, а стан расійскай валютна-фінансавай сістэмы некіруемым. Гэта выяўляецца, заявіў дакладчык, у дэстабілізацыі курсу рубля і павышэнні інфляцыі, падзенні інвестыцый і эканамічнай актыўнасці, што з’яўляецца вынікам антырасійскіх санкцый. Але асаблівая небяспека для нацыянальнай эканомікі – вываз з краіны капіталу, аб’ём якога ў 2014 годзе склаў каля 150 млрд дол., а ў бягучым годзе чакаецца да 100 млрд дол., г.зн. 8–12% ВУП. Усяго ж адток капіталу з Расіі за апошніх 10 гадоў перавысіў трыльён долараў. Галоўная прычына такога стану – «аўшорызацыя і адкрытасць расійскай эканомікі». У гэтай сувязі С. Ю. Глазьеў рэзка раскрытыкаваў Цэнтральны банк Расіі, які ажыццяўляе сваю дзейнасць пад дыктоўку МВФ. Ён на канкрэтных лічбах паказаў, што рэкамендацыі МВФ накіраваны не на развіццё і нават не на стабілізацыю расійскай эканомікі, а зусім наадварот – на яе далейшае разбурэнне. Гаворка ў дадзеным выпадку ішла аб празмерным «сціску грашовай масы», у выніку чаго адбываецца знішчэнне вытворчасці, паколькі прадпрыемствы застаюцца без фінансавых сродкаў. Таму для аздараўлення эканомікі навуковец прапанаваў пераарыентаваць яе з вонкавых на ўнутраныя крыніцы фінансавання, рэзка павялічыць грашовую масу, прыняць неадкладныя меры па прадухіленні вывазу з краіны капіталу. С. Ю. Глазьеў закрануў і знешнепалітычныя праблемы. Ён лічыць, што Вашынгтон у адносінах да Расіі праводзіць тую ж агрэсіўную палітыку, што і ў адносінах да СССР: арганізаваная супраць Расіі вайна «вядзецца на аснове выкарыстання сучасных інфармацыйна-кагнітыўных і валютна-фінансавых тэхналогій». Для Расіі, на думку С. Ю. Глазьева, у перспектыве магчымы тры сцэнарыі: ці праводзіць самастойную палітыку і ажыццяўляць развіццё нацыянальнай эканомікі на базе ўнутраных рэсурсаў; ці стаць перыферыяй ЗША; ці апынуцца перыферыяй Кітая. Рэалізацыя толькі першага сцэнарыя забяспечыць Расіі суверэнітэт, а яе грамадзянам – дабрабыт і бяспеку.

На кангрэсе значная ўвага нададзена праблеме кіравання ў сучасным свеце – вострыя спрэчкі вяліся на пасяджэннях секцый «Глабальнае кіраванне» і «Глабальная і рэгіянальная дыпламатыя, дыпламатыя гарадоў, народная дыпламатыя», а таксама на Міжнародным навуковым сімпозіуме па ўстойлівым развіцці «Глабальнае развіццё: лакальныя канфлікты і выклікі ў XXI стагоддзі». Галоўная выснова – неабходнасць распрацоўкі і прыняцця сусветнай супольнасцю надзейнай прававой асновы глабальнага кіравання – такой прававой сістэмы, якая змагла б гарантаваць роўныя ўмовы розным суб’ектам міжнароднага права. Гэтыя пытанні атрымалі асвятленне ў дакладах на секцыі «Перспектывы развіцця міжнароднага права ва ўмовах глабалізацыі грамадскіх адносін».

Падчас работы форуму атрымала далейшае паглыбленне філасофскае вучэнне аб глабалізацыйных працэсах як сацыяльных феноменах. Гэтыя аспекты глабалізацыі абмяркоўваліся на секцыі «Філасофскія праблемы глабалізацыі», мадэратарам якой з’яўляўся віцэ-прэзідэнт Расійскага філасофскага таварыства А. Н. Чумакоў. Навукоўцамі і палітыкамі абмяркоўваўся не толькі праект глабалізацыі, але і альтэрнатыўныя праекты. У прыватнасці, аб гэтым ішла размова на VI Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Зіноўеўскія чытанні: Аляксандр Зіноўеў і сучасныя ідэалогіі», якая праходзіла пад патранажам Міжнароднага навукова-адукацыйнага цэнтра імя А. А. Зіноўева. Адбыліся панэльныя дыскусіі на тэмы «Роля філасофіі ў ідэалогіях і стратэгіях развіцця Расіі і свету», «Ідэалогія глабалізацыі і магчымыя альтэрнатывы», «Ідэалогія будучыні» і інш.

Пытанні рэгіяналізацыі і ў асаблівасці перспектывы BRICS разглядаліся на II Міжнародным сімпозіуме «Мегагісторыя і глабальная эвалюцыя», у рамках якога працавала навуковая школа для моладзі «Гістарычная глабалістыка: гістарычная эвалюцыя, сучаснасць і прагнозныя сцэнарыі развіцця глабальных сетак сувязей, глабальных працэсаў і інстытутаў планетарнага маштабу, а таксама ролі ў іх Расіі і BRICS».

Далейшае развіццё на кангрэсе атрымала канцэпцыя наасферызму. Аб ёй ішла размова на XXIII Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Кандрацьеўскія чытанні: тупікі глабальнай эканомікі, пошук новай тэарэтычнай парадыгмы», мадэратарам якой з'яўляўся навуковы кіраўнік Інстытута эканомікі РАН Р. С. Грынберг. Выпрацаваныя на гэтай канферэнцыі прапановы ўвайшлі ў Рэкамендацыі Міжнароднага навуковага кангрэса. Адна з іх – наступная: «Удзельнікі Кангрэса падтрымліваюць палажэнне, што генеральнай мэтай пераадолення цывілізацыйнага крызісу і выхаду на траекторыю глабальнага ўстойлівага развіцця з'яўляецца станаўленне інтэгральнай, гуманістычна-наасфернай цывілізацыі на базе дыялогу і партнёрства цывілізацый і дзяржаў, сацыяльных слаёў і пакаленняў пры вядучай ролі ААН».

Не абышлі ўвагай арганізатары кангрэса і экалагічную праблематыку. Гэтаму была прысвечана праца секцыі «Глабальная экалогія і энергетыка». Атрымалі асвятленне і такія жыццёва важныя пытанні, як міжнародны турызм ва ўмовах глабалізацыйных выклікаў сучаснасці, чаму была прысвечана спецыяльная секцыя, менеджмент сацыяльных трансфармацый (працавала міжнародная школа ЮНЕСКА), дзейнасць ААН (быў арганізаваны круглы стол «Крызіс цывілізацыі ў кантэксце палітычных працэсаў і дзейнасць ААН»). Дыскусіі закранулі і праблему сучаснай адукацыі. У гэтым ключы выбудоўвалася праца секцый «Глабальная адукацыя і ўніверсітэты: сучасныя тэндэнцыі і погляд у будучыню» і «Нацыянальныя і глабальныя ўніверсітэцкія рэйтынгі: перспектывы развіцця».

І вядома ж, аргкамітэт міжнароднага форуму не мог не ўключыць у рабочую праграму спецыяльнае пасяджэнне вучоных, прысвечанае сацыяльнаму прагназаванню. Гэтыя пытанні атрымалі развіццё ў працэсе іх ўсебаковага абмеркавання на круглым стале «Глабальная будучыня: этнічныя выклікі і прастора магчымасцей для дружбы народаў». Зацікаўленасць выклікаў навуковы даклад замежнага члена РАН А. А. Акаева, у якім раскрыты метады камп'ютарнага мадэлявання з выкарыстаннем матэматычных макрамадэляў, якія адэкватна апісваюць дынаміку сацыяльна-эканамічнага развіцця з улікам хвалевых цыклаў М. Д. Кандрацьева. Сама назва круглага стала нацэльвала дакладчыкаў, якія прадстаўлялі розныя этнасы і дзяржавы, на ўзаемапавагу і сяброўства. Хацелася б асабліва падкрэсліць, што сама атмасфера кангрэса ў немалой ступені спрыяла ўзаемаразуменню яго ўдзельнікаў.

У працы кангрэса актыўна ўдзельнічала моладзь – перш за ўсё студэнты, аспіранты і магістранты факультэта глабальных працэсаў МДУ імя М. В. Ламаносава. І не толькі ў якасці актыўных памочнікаў аргкамітэта, але і ў якасці аналітыкаў, даследчыкаў, што прадставілі цікавыя навуковыя даклады. Для маладых даследчыкаў у рабочую праграму былі ўключаны навуковыя школы, II Міжнародны сімпозіум «Мегагісторыя і глабальная эвалюцыя». Такім чынам, кангрэс на практыцы рэалізаваў ідэю пераемнасці ў навуковых супольнасцях.

Удзельнікі Міжнароднага навуковага кангрэса падрыхтавалі шэраг канкрэтных рэкамендацый па ўстойлівым развіцці свету, якія ў выглядзе праекта адобраны і прыняты за аснову на заключным пленарным пасяджэнні. Быў прыняты таксама зварот да навуковых, грамадскіх, палітычных і бізнес-колаў. Думаецца, гэтыя дакументы – Рэкамендацыі і Зварот – пазітыўна ўспрымуць у шырокіх колах грамадства, яны знойдуць і практычную рэалізацыю ў бліжэйшы час.

У рабоце кангрэса прынялі ўдзел і беларускія вучоныя. З навуковым дакладам «Беларуская наасферная мадэль глабальнага кіравання стваральным сацыяльна-эканамічным развіццём» выступіў саветнік НАН Беларусі, акадэмік П. Г. Нікіценка. Ён даў цэласную характарыстыку беларускай сацыяльна-эканамічнай сістэмы развіцця, асаблівасцю якой з'яўляецца спалучэнне інстытутаў рынкавай эканомікі з дзейснымі механізмамі дзяржаўнага рэгулявання і рэалізацыяй канкрэтных праграм сацыяльнай палітыкі. Вучоны адзначыў, што беларуская мадэль адпавядае гістарычным, палітычным, геаграфічным, культурным і іншым асаблівасцям дзяржавы. Яе галоўныя складнікі – чалавек і прыродаахова. Пры яе распрацоўцы выкарыстоўваліся перш за ўсё уласныя тэарэтычныя ідэі, але ў ёй знайшло водгук і вучэнне вядомага рускага эканаміста А. Шторха аб народным багацці і цывілізацыі – дабротах нематэрыяльных, унутраных, да якіх аднесены здароўе, уменне, адукацыя, густ, норавы, звычаі, рэлігійнасць, бяспека, вольны час, а таксама яго ідэя аб магчымасці дасягнення гармоніі ва ўмовах рынкавай гаспадаркі пры зацікаўленасці і актыўнай дзейнасці ў гэтым кірунку дзяржавы. У дакладзе прадстаўлена і мадэль наасфернага ўстойлівага развіцця эканомікі як светапоглядны і ідэалагічны арыенцір Беларусі, як магчымы шлях яе інтэграцыі ў сусветную супольнасць. Толькі цяпер, падкрэсліў дакладчык, у тэорыях развіцця чалавечага і сацыяльнага патэнцыялу (капіталу), у вучэнні пра эканоміку ведаў, у найноўшым вучэнні пра наасферную эканоміку

сталі ў поўным аб'ёме распрацоўвацца праблемы, узнятыя калісьці А. Шторхам. Навукоўцы і палітыкі не выпадкова ўсё часцей звяртаюць позірк да светапогляднай мадэлі наасфернага ўстойлівага развіцця, якая ўяўляе сабой новую логіку сацыяльна-эканамічных стваральных паводзін чалавека на Зямлі. Распрацоўка канцэпцыі і мадэлі развіцця новага (наасфернага) укладу эканомікі, інавацыйнай стваральнай стратэгіі ўстойлівай жыццядзейнасці Беларусі ва ўмовах глабалізацыі ажыццяўлялася ў апошняе дзесяцігоддзе і аўтарам гэтага даклада. На думку П. Г. Нікіценкі, галоўным эканамічным рэсурсам наасфернай эканомікі выступае не столькі інфармацыя ў выглядзе новых тэхналогій і тэхнікі (гэта другаснае), колькі розум, які забяспечвае развіццё патэнцыялу асобы, назапашванне яго наасфернага тварнага патэнцыялу. Адметнай асаблівасцю наасфернай эканомікі з'яўляецца рост навукаёмістасці ВУП і рэалізацыя як прыярытэтнай патрэбы чалавека бесперапыннасці яго адукацыі на аснове росту навукаёмістасці ВУП. Менавіта бесперапыннасць адукацыі забяспечвае рост якасці працоўных рэсурсаў і магчымасць перспектыўнага росту арганічнага будынка вытворчасці, а такім чынам, павышэння яго інтэнсіфікацыі і эфектыўнасці на аснове навукова-тэхнічнага прагрэсу. У сувязі з вышэйпададзеным, зазначыў П. Г. Нікіценка, намі зроблена спроба распрацаваць светапоглядную парадыгму і арганізацыйна-кіраўнічую мадэль жыццядзейнасці на аснове духоўна-маральнай гармоніі самога Чалавека, Прыроды і Чалавецтва ва ўзаемадзеянні з Космасам.

У дакладзе «Саюзніцкія адносіны Беларусі і Расіі ў кантэксце сучаснага глабалізаванага свету» аўтар гэтых радкоў выказаў меркаванне, што розныя аспекты ўзаемаадносін Беларусі і Расіі, як і пытанні пабудовы Саюзнай дзяржавы, трэба разглядаць і праектаваць менавіта праз прызму тых сучасных дынамічных эканамічных, сацыяльных і геапалітычных працэсаў, якія штодзённа і вельмі яскрава змяняюць аблічча краін і народаў планеты. Рэалізацыі дамоўленасцей дзвюх краін у значнай ступені перашкаджаюць іх розныя «вагавыя катэгорыі» і значныя адрозненні сацыяльна-эканамічных мадэляў. Ваенныя канфлікты, якія пракаціліся ў Расіі, карупцыйныя скандалы, дэфолт 1998 года і іншыя негатыўныя з'явы значна панізілі прывабнасць яе вобраза. Умацаванню Саюзнай дзяржавы сур'ёзна перашкаджае недастатковая распрацаванасць яе ідэалагічнай асновы, г. зн. тэарэтычнай канцэпцыі і праграмы, якія б у сістэмным выглядзе раскрывалі матэрыяльныя і духоўныя асновы яе пабудовы і існавання ў доўгатэрміновай перспектыве. Пры распрацоўцы канцэптуальнай мадэлі ідэалогіі Саюзнай дзяржавы ўяўляецца важным засноўвацца на багатым айчынным гістарычным і сучасным вопыце, пры гэтым не капіраваць палітычныя схемы СССР ці Еўропы, якія сябе не апраўдаўлі, але ў той жа час і не ігнараваць пазітыўны міжнародны вопыт міждзяржаўных адносін.

Кангрэс стаў карысным як для сацыяльна-гуманітарнай навукі, у тым ліку беларускай, так і для сацыяльнай практыкі. Ён дазволіў больш дэталёва азнаёміцца з разнастайнай сацыяльна-палітычнай карцінай сучаснага свету, рознымі навуковымі школамі і іх распрацоўкамі. Мы змаглі падзяліцца і сваімі меркаваннямі адносна прыроды, сутнасці і шляхоў вырашэння сучасных глабальных праблем. Усё гэта, несумненна, будзе спрыяць далейшаму плённаму даследаванню працэсу развіцця чалавека і грамадства ў XXI стагоддзі.

## Информация об авторе

*Адуло Тадеуш Иванович* – д-р филос. наук, проф., зав. Центром социально-философских и антропологических исследований. ГНУ «Институт философии НАН Беларуси» (ул. Сурганова, 1, корп. 2, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail : tadoul@mail.ru.

## Information about the author

*Adoulo Tadeouch Ivanovich* – D. Sc. (Philos.), Professor, Head of the Center of Social-Philosophical and Anthropological Research. Institute of Philosophy of the National Academy of Sciences of Belarus (Surganov Str., 1, b. 2, 220072, Minsk, Republic of Belarus). E-mail : tadoul@mail.ru.

## Для цитирования

Адула, Т. І. Зменлівыя контуры свету XXI стагоддзя / Т. І. Адула // Герцев // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2016. – № 4. – С. 122–125.

## For citation

Adoulo, T. I. The changing contours of the world of the 21st century. Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus, humanitarian series, 2016, no. 4, pp. 122-125.